[Пра]летары ўсіх краёў, злучайцеся!
5 сьнежня 1931 г.
№ 2?? (1549)

Чырвоная зьмена

[Ор]ган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

Напярэдадні IV пленуму ЦК ЛКСМБ

Штурмуйце прарывы ўсеабучу!

„Больш клопатау аб народным настаўніку“ (Правда)

Падрыхтоўчая работа комсамолії да пленуму ЦК ЛКСМБ павінна ісьці шляхам шырокага разгортваньня агляду-самаправеркі рэалізацыі пастаноў партыі аб сярэдняй і пачатковай школе. Перадпленумаўскі пэрыод павінен быць максымальна выкарыстаны для праверкі і ўзьняцьця на вышэйшую ступень шэфства комсамолії над усеабучам. Такім чынам, комсамольскія організацыі павінны сустрэць 4-ы пленум ЦК ЛКСМБ баявым штурмам ліквідацыі прарываў у шэфстве над усеагульным навучаньнем.

Ва ўсёй гэтай рабоце вялікую ўвагу патрэбна аддаць справе ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду аб паляпшэньні матар'яльнага забясьпечаньня народнага настаўніка. „Мясцовая організацыя—гаворыць „Правда“—абавязаны бязумоўна выканаць дырэктывы ЦК і ўраду. Усялякія гаворкі аб тым, што настаўнік пачакаюць, што настаўнікі як-небудзь абыйдуцца, нельга разглядаць інакш, як опортунізм. Падобныя гаворкі льюць ваду на млын ворагаў савецкай улады“. Гэтае паказаньне ленінскай „Правды“ павінна быць пакладзена ў аснову барацьбы комсамольскіх організацый за ленінскія адносіны да настаўніка.

Да зьлёту ўдарнікаў фінфронту

[Сё]ньня адчыняецца зьлёт ударнікаў [фінан]савага фронту. Выкананьне пя[цігод]кі ў 4 гады, „пасьпяховае сканч[эньн]е плянаў 3-га рашаючага, буй[ныя т]эмпы соцыялістычнага будаўніц[тва аб]авязваюць усю грамадзкасьць [узмацніць у]вагу фінансавую сыстэму, узмацніць [б]арацьбу за ўнутры „прамысловае [на]капленьне, прыцягваючы сродкі [насел]ьніцтва на справу соцыялістычнага будаўніцтва.

[До]вывед паказаў, што раёны, якія [у]сьвядомілі вялікае значэньне [выка]наньня фінплянаў, у асаблівасьці [мобілі]зацыі ўнутраных рэсурсаў на [справу] соцыялістычнага будаўніцтва [дабі]ліся бальшавіцкую перамогу.

[Гом]ельская пролетарская грамадзкасьць, на падставе шырока разгорнутага соцспаборніцтва і ўдарнітва [вы]канала фінплян 3-га кварталу [рашаю]чага году.

[Фінэ]стафэта—адна з лепшых форм [масавай] работы—высунула ў рад перадавых Менскі, Віцебскі, Жыткавіцкі, [...]кі, і інш. раён. Комсамольскія організацыі гэтых раёнаў здолелі [выйсь]ці пераможцамі ў барацьбе за [фінплян].

[У т]ы часам рад раёнаў (Лоеў, Красн[апольл]е, Слуцак, Жлобін і інш.) не[дацані]лі ролі фінпляну ў далейшым [разгорт]ваньні соцыялістычнага будаўніцтва, [не] разгарнулі організацыйна-масавай работы, замянілі опэрацыйнае [кіраўні]цтва голым адміністраваньнем [...]яцу ў месяц, з дэкады ў дэкаду [не] выконваюць фінпляну.

[Н]овыя формы і мэтады барацьбы за выкананьне фінпляну, у[дарніцтва] і фінэстафэты, вылучылі [тыся]чы і сотні ўдарнікаў, сапраўдных [ба]рацьбітоў за выкананьне фінпляну. Сярод іх шмат комсамольцаў. [...] падагуліць вопыт масавай работы, перанесьці лепшыя прыклады перадавых раёнаў у адстаючыя, замацаваць і яшчэ больш павялічыць лік ударнікаў фінфронту — склікаецца зьлёт ударнікаў.

Зьлёт павінен будзе дапамагчы пасьпяховаму правядзеньню наступных задач:

Завяршыць кампанію па падпісцы на пазыку „3-ці рашаючы“. Поўнасьцю і ў найкарацейшы тэрмін сабраць абавязковыя плацяжы і зборы, спагнаць усе нядоімкі з кулака.

Выззваліць цзяржаўныя сродкі коопэрацыйнага таварнага звароту, выканаўшы гадавы плян мобілізацыі сродкаў па лініі спажыўкоопэрацыі.

Ліквідаваць прарыў па лініі ашчадкас—сапраўды ажыцьцёвіць лёзунг: „Ніводнага працоўнага без ашчадкніжкі“.

Поўнасьцю пагасіць запазычанасьць дзяржаве па сельска-гаспадарчых пазыках, забясьпечыўшы бесьперабойнае фінансаваньне сельскай гаспадаркі. Організаваць колгасную грамадзкасьць вакол выкананьня фінансавага пляну.

Поўным выкананьнем пляну рэалізацыі акцый Трактарацэнтру забясьпечыць будаўніцтва новых 22 машынатрактарных станцый на тэрыторыі БССР.

Правільна організаваць фінансавую гаспадарку ў колгасах тэрмінова скончыць складаньне фінпляну.

Мобілізуючы ўвагу ўсёй грамадзкасьці, дабіцца поўнага выкананьня не пазьней 10 сьнежня фінпляну 4-га кварталу.

Узброіўшыся вопытам перадавых раёнаў, БССР павінна сустрэць 4-ы заключны год пяцігодкі такой організацыйна-масавай працай, якая-б забясьпечыла штодзённае, штодэкаднае штомесячнае выкананьне і перавыкананьне фінпляну.

Рашаючыя дні пуску 518

[Пу]сьціць у бліжэйшыя дні— —Гомельскі маргарынавы

[Г]омельская комсамолія — у адказе за гэта

[Ска]нчыць будаўніцтва Гомельскага маргарынавага

Будаўніцтва Гомельскага маргарынавага заводу, які павінен будзе даваць дзяржаве тысячу тон маргарыну, зацягваецца.

Завод павінен быў ужо ўступіць у строй, аднак будаўнічыя работы першай чаргі далёка яшчэ не скончаны.

Галоўны корпус пабудаван на 85 проц., кацельная і пераперагрэ[...]—на 70 проц., трансформатарная будка на 92 проц. і г. д. [Монт]ажныя работы праведзены толькі на 32 проц. апаратура ўстаноў[лена на] 35 проц. Скачэньне монтажу зрываецца за адсутнасьці матэрыялаў, радзіма падшыпнікаў, балтоў і іншых рэчаў.

Трэўгнік заводу да апошніх дзён не скарыстаў усе магчымасьці, каб разгарнуць ударныя тэмпы ў будаўніцтве, не патурбаваўся, каб [за]вод (Масква—„Компрэсар“ і „Перастрой“ Варонеж—„Комінтэрн“) [сва]ечасова прадставілі абсталяваньне.

А зараз трэўгнік заводу нападае на аб'ектыўныя, спакойна [ідучы] да зрыву.

Гомельская комсамолія надзвычай мала ўвагі ўдзяляла будаўніцтву [...]. Не было ўстаноўлена опэрацыйнага кантролю за ходам будаўніцтва.

Не лепш адносіцца да будаўніцтва і Белбудкантора, якая да гэтага часу не забясьпечвала пабудову дастатковай колькасьцю рабочай сілы. Монтажныя работы зараз не могуць праводзіцца дзякуючы ад[сутнасьці] шклянак і дзьвярэй.

Маргарынавы завод зьяўляецца адным з 518, і павінен быць пушчаны да канца 3-га, рашаючага году пяцігодкі. За гэта павінна ўзяцца [...] грамадзкасьць Гомельшчыны і ў першую чаргу комсамол.

Узмацніць опэрацыйны кантроль за ходам будаўніцтва, дабіцца тэрміновай дастаўкі абсталяваньня, дапамагчы організаваньню набору рабочай сілы, устанавіўшы тэхнічны карантын для яе—вось задачы Гомельскай комсамолі.

БЕЛТА.

Культпроп ЦК КП(б)Б паведамляе, што 7 сьнежня 1931 г., а 6-й гадзіне увечары у вялікай зале Дому Комасьветы імя Карла Маркса

АДЧЫНЯЕЦЦА

ПЕРШАЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ ПАРТЫЙНАЯ НАРАДА

па пытаньнях мастацтва

з удзелам партыйнага і комсамольскага актыву Менскай організацыі працаўнікоў друку, комуністых-пісьменьнікаў, культпропаў ячэек КП(б)Б і ЛКСМБ і г. д.

Рэгістрацыя дэлегатаў у фоэ Дому Комасьветы з 5 гадз. увеч. Уваход на нараду па дэлегацкіх білетах і запрашальных білетах Культпропу ЦК КП(б)Б.

Дэлегаты, атрымаўшыя выклік на 1-га сьнежня, павінны усе прыбыць 7-га сьнежня.

Культпроп ЦК КП(б)Б

Галавацяпству нанесьці ўдар!

Настаўнікі Капцэвіцкай ФЗС заводу „Зьвязда“ (Петрыкаўскі раён) недастаткова забясьпечаны продуктамі і харчаваньнем і зусім не атрымліваюць прамтавараў. Старшыня рабочкому т. Бусель М. заяўляе: „ня маем дырэктыў наконт гэтага“. Настаўнікі Капцэвіцкай ФЗС забясьпечваюцца на 3-му сьпісу, а рабочыя гэтага заводу—па 1-му сьпісу.

У сталоўцы настаўнікі па гадзіне і болей стаяць у чарзе за абедам.

Патрыкоўская РСІ павінна неадкладна прыцягнуць да адказнасьці зрыўшчыкаў забесьпячэньня настаўнікаў.

Грайзель. Г.

„Ня лічу мэтазгодным“

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб школа патрабуе забясьпечаньня настаўнікаў па нормах прамысловых рабочых данага раёну. Гэтая пастанова злачынна ігнаруецца ў Тураўскім раёне. РВК і аддзел Нарасьветы ніяк ня ніка[к] ва цца матар'яльным станам настаўнікаў. Настаўнікі ніякага пайка, прамтавараў і абутку не атрымліваюць.

Старшыні вясковых спажыўтаварыстваў неаабайна адносяцца да патрэб настаўнікаў. Калі ў Азяранах б'ыло прапанавана старшыні сельпо т. Леўкаўцу Б. аб паляпшэньні матар'яльнага становішча настаўнікаў Азяранскага сельсавету, дык апошні ня выконвае гэтае пастановы. Ён заяўляе: „ня лічу мэтазгодным гаварыць з настаўнікамі і паляпшаць ваша становішча.

Калі былі прысланы некалькі пар ботаў для настаўнікаў, дык РВК разьмеркаваў іх не па прызначэньню, ня гледзячы на вострую патрэбу з боку настаўнікаў у абутку.

Бязумоўна, што гэтакія абураючыя адносіны да матар'яльнага забесьпячэньня настаўнікаў ня могуць не адбіцца на якасьці навучаньня, на ўсёй рабоце настаўніка.

Шутэнка А.

У Калгасцэнтры ведаюць...

ШКМ рыхтуе кадры для соцыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Здавалася-б, што Белколгасцэнтр павінен вялізарную увагу аддаваць рабоце ШКМ. Аднак, апрача распараджэньня колгасам аб вылучэньні фондаў продуктаў настаўнікам, нічога ня зроблена. Больш таго Белкалгасцэнтр не праверыў як выконваецца яго дырэктыва, а выкананьне яе з рук вон дрэннае.

У Белколгасцэнтры ведаюць, што настаўнікі Лагойскага раёну не атрымліваюць ад колгасаў продуктаў харчаваньня, ведаюць, што у Глускім раёне фонды для забесьпячэньня настаўнікоў скарыстоўваюцца на іншыя мэты. Ведаюць і пра тое, што настаўнікі Любаніцкага сельсавету (Бабруйскі раён) з ліпеня месяца не атрымліваюць цукру... Так, ведаюць але ніякіх захадаў ня прымаюць!

У цэлым шэрагу раёнаў злачынна ігнаруюцца дырэктывы партыі і ўраду аб забясьпечэньні народнага настаўніка. Амаль адсутнічае дырэгуляваная аплата працы настаўнікам.

Белколгасцэнтр павінен неадкладна прыняць усе залежачыя ад сябе меры для выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб паляпшэньні матар'яльнага стану настаўніцтва. І ў першую чаргу у саміх сьценах, ў саміх работнікаў Белколгасцэнтру павінна разгарнуцца барацьба за ленінскія адносіны да народнага настаўніка.

Брыгада „Ч. З.“ Кавалевіч Граховіч, Сабалеўскі, Кухарка.

Вітаньне ўдарнікам фінэстафэты!

Сёньня—зьлёт ударнікаў фінфронту

Вывучаючы вопыт перадавых раёнаў, даб'емся выкананьня фінпляну 3-га рашаючага

Палепшыць работу дзяржбанку

На 20-е лістапада квартальнае заданьне па мобілізацыі сродкаў у Рагачэўскім раёне выканана толькі на 47,7 проц., 2-х месячны плян мобілізацыі фінансавых сродкаў—на 54 проц., квартальнае заданьне па рэалізацыі пазыкі на 17,7 проц. па рэмлізацыі акцый Трактарацэнтру—на 10,9 проц., па распаусюджваньню машынных абавязацельстваў—на 14,2 проц., па паянакапленьню—на 38 проц.

Дрэнна працуе Рагачэўскае аддзяленьне дзяржаўнага банку. Работнікі дзяржбанку спазьняюцца на самацёк.

Нават у спагнаньні абавязковых плацяжоў ёсьць недавыкананьне.

Падатку паступіла 82,4 проц., страхоўскі 81, 4 проц., самаабкладаньня 53,2 проц. А пляны па спагнаньню абавязковых плацяжоў павінны быць выкананы да 1-га сьнежня г. г.

Найбольш адсталымі с-саветамі у гэтай рабоце зьяўляюцца: Гарадзецкі с-с., Стралкоўскі, Прыбарскі, Станькаўскі, Курганскі. Меркаловіцкі, Запольскі і інш.

Вялікіх посьпехаў дабіліся: Асаўніцкі с-с—на 20-е лістапада выканаў падаковы плян на 104,4 проц., Хальцянаўскі—на 98,4 проц. Вішэнскі на 97,9 проц., Брушынаўскі—94,4 проц.

Зусім недапушчальна разгорнута работа па спагнаньню самаабкладаньня у Курганскім, Гадзімавіцкім ды інш. с-саветах.

У апошнім квартале неабходна зрабіць рашучы перагом, каб палепшыць работу па мобілізацыі фінансавых сродкаў як у адстаючых с-с, так і ў раённых організацыях.

А. Р.

Выканаць фінплян да 10 сьнежня

Фінэстафэта па Слуцкім раёне ў некаторых галінах не дала яшчэ належных вынікаў.

Асабліва дрэнна наладжана рэалізацыя акцый Трактарацэнтру—ўсяго рэалізавана 3 проц. заданьня. Пляна мобілізацыі сродкаў па паенакапленьню выканана усяго на на 8 проц., па ўступных узносах у колгассыстэме на 7,3 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што райспажыўсаюз, ракалгассаюз і МТС недаацанілі мобілізацыю ўнутраных рэсурсаў.

Тым часам работа па спагнаньню ўступных, мобілізацыі мэтавых уносаў і рэалізацыі трактарных акцый па колгасыстэме зьяўляецца адным з важнейшых вагароў у барацьбе за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў.

Дрэнна праходзіць фінэстафэта ў Гацуеўскім, Прошчыцкім, Мусіцкім і Палікарпаўскім сельсаветах.

Пад кіраўніцтвам партыйна-комсамольскіх ячэек паказваюць сапраўды бальшавіцкія прыклады змаганьня за фінплян Іванава-Агародніцкі і Казловіцкі сельсаветы. Брыгадзір „Ч. З.“ Бранав ец'

Пануе няўважлівасьць

Школы Баранькаўскага сельсавету (Сіроцінскі раён) у надзвычайна дрэнным стане. У Хведзькаўскай школе няма ніякіх падручнікаў. вучні займаюцца па старых падручніках, ды і тых мізэрная колькасьць. Сшыткі і алоўкамі і інш. прыладамі школы забясьпечваюцца кепска.

Ня лепш справа з забесьпячэньнем настаўніцтва Кароцкае сельпо на шматлікія патрабаваньні настаўніцтва не зварачвае ўвагі.

Е.



Уключыць саўгасы ва ўсесаюзны сталінскі паход комса[...]

Прогрэсыўна-прэміяльная зьдзельшчына—ключ да новых пера[...]

УЗЬНІМЕМ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ ПРАЦЫ Ў СЬВІНАВОДЧЫХ ГАСПАДАРКАХ, ЗЬНІЗІМ САБЕКОШТ ПРОДУКЦЫІ

Па-бальшавіцку ажыцьцявіць ў саўгасах і калгасах 6 умоў тав. Сталін[а]

„Капіталізм можа быць канчаткова пераможан і будзе канчаткова пераможан тым, што соцыялізм створыць новую, больш высокую вытворчасьць працы"

(Лэнін, „Вялікі пачын", том 16 стр. 254).

Лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове даў дырэктыву: „Рашуча ліквідаваць абязьлічку ў доглядзе за жывёлай. Забясьпечыць лепшыя ўмовы для работы сьвінароў, сьвінарак, даярак, скотнікаў і пастухоў, ад якіх у значнай меры залежыць выкананьне планаў выхаду і якасьці таварнай продукцыі, перавесьці работу па догляду за жывёлы на зьдзельна-прэміяльную сыстэму".

Пытаньні організацыі і аплаты працы ставяцца на адно з першых месц у організацыйна-гаспадарчым умацаваньні саўгасаў і колгасаў.

Комсамольская організацыя павінна стаць ініцыятарам укараненьня прэміяльна-прогрэсыўнай зьдзельшчыны. „Комсомольская правда" паставіла пытаньне аб уключэньні саўгасаў у комсамольскі Усесаюзны сталінскі паход. Комсамольскія ячэйкі саўгасаў павінны падхапіць гэту ініцыятыву.

5-га сьнежня праводзіцца ўсебеларуская нарада трыкутнікаў жывёлагадоўчых саўгасаў разам з сакратарамі комсамольскіх ячэек. Гэтая нарада павінна будзе таксама ўключыцца ў сталінскі паход комсамолу і вызначыць конкрэтныя мерапрыемствы для ажыцьцяўленьня пастановы апошняга пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб соцыялістычнай жывёлагадоўлі і 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

„1931 і 1932 г. па[вінн]ы быць гадамі такога рашучага пералому у ра[зь]віцьці соцыялістычнай ж[ы]вёлагадоўлі, якімі б[ылі] 29-30 гады ў справе ор[га]нізацыі соцыялістыч[най] збожжавай гаспадар[кі]"
(З адозвы ЦК УсеКП і СНК СССР).

Павышэньнем вытворчасьці працы зьнізім сабекошт продукцыі

Побач з колькасьцю продукцыі, якая здаецца дзяржаве, галоўная наша ўвага павінна быць накіравана на зьніжэньне сабекошту гэтай продукцыі. Сабекошт продукцыі паказвае наколькі правільна організавана тая, альбо іншая галіна гаспадаркі, сабекошт будзе ніжэй там, дзе лепш організавана справа, і вышэй там, дзе гаспадарка організавана дрэнна, дзе сродкі выкарыстоўваюцца няправільна.

Кошт рабочай сілы складае прыблізна да 20 і больш процантаў ад усяго кошту адзінкі продукцыі сьвініны. Таму ясна, што для зьніжэньня сабекошту продукцыі сьвініны трэба правільна організаваць працу. Зьніжэньне сабекошту продукцыі на данным этапе гаспадарчага будаўніцтва—адна з важнейшых задач. Тым часам пытаньням організацыі працы і рацыяналізацыі вытворчасьці ў сьвінагадоўлі да апошняга часу яшчэ мала ўдзялялася ўвагі. Мы яшчэ недастаткова ўявілі сабе, што „посьпехі ў справе павышэньня вытворчасьці працы—лепшы, несакрушальны і сапраўды гранітны аплот справы соцыялізму". (Даклад Молатава на Маскоўскім Савеце ў 14 гадаў. Кастрычніка).

Тэхнорміраваньне дапамагае рацыянальнай організацыі працы на аснове соцыялістычных мэтадаў

Каб правільна організаваць догляд за сьвіньнямі, каб правільна расставіць рабочую сілу па асобных цэхах, неабходна ўстанавіць нормы выпрацоўкі на аднаго рабочага.

Варта сказаць пару слоў аб няправільных і нават шкодных поглядах на тэхнічнае нормаваньне.

Некаторыя лічаць, што тэх. нормаваньне зьяўляецца чыста разьліковай, арытмэтычнай опэрацыяй і толькі. Такі погляд трэба адкесьці, як шкодны. Нельга адрываць тэх нормаваньне ад тых умоў, у якіх выконваецца праца, што падлягае нормаваньню. Тэх.норма выводзіцца ў выніку пэўнага злучэньня працы і іншых фактараў вытворчасьці (інструмант, абсталяваньне сьвінарніка і інш.) Нельга, напрыклад, устанаўляць аднолькавыя нормы нагрузкі на сьвінарак, калі адна з іх выносіць гной вядром, а другая вывозіць гной у тачцы, спэцыяльна для гэтага прыстасаванай. Усім відавочна, што пры розных спосабах работы і вытворчасьць будзе розная. Возьмем другі прыклад. У большасьці сьвінакалгасаў БССР бульба запарваецца на кухні, потым гэтая бульба развозіцца па сьвінарніках, а то і ў вёдрах, разносіцца самімі сьвінаркамі, потым замешваецца і раздаецца сьвіньням. Такім чынам, на раздачы корму сьвінару прыходзіцца выконваць цэлы рад процэсаў, што адымае ў яго шмат часу. А калі ўявіць такія ўмовы, дзе корм замешваецца на кухні спэцыяльна прызначанымі рабочымі, і ў гатовым відзе прывозіцца на сьвінарнік, то сьвінару застаецца толькі раздаць гэты корм. Зусім ясна, што другі сьвінар зможа абслугоўваць значна большае пагалоўе, чым першы.

Неабходна адзначыць, што норма выпрацоўкі ня можа быць узята на „вока" і праведзена большасьцю галасоў,—норма вызначаецца пэўным злучэньнем працоўнай сілы з умовамі, у якіх выконваецца праца.

Устанавіць норму нагрузкі, гэта зн. устанавіць абавязкі сьвінара, парадак выкананьня работ і тэхніку абслугоўваньня сьвіней. Такім чынам, каб дабіцца павышэньня вытворчасьці працы ў выніку тэх. нормаваньня, неабходна рацыяналізаваць працоўныя процэсы сьвінара, правільна організаваць яго працу.

Адсюль відочна, што тэхнормаваньне і рацыяналізацыя працы—дзьве рэчы, неразрыўна зьвязаныя адна з другой. Праводзячы тэхнормаваньне ні ў якім выпадку нельга ўпусьціць такі важны фактар павышэньня вытворчасьці працы, як соцспаборніцтва і ўдарніцтва, якія далі магчымасьць перавысіць усе існуючыя да гэтага часу нормы. Ня прымаць пад увагу гэтых фактараў ня, ўлічваць працоўнага энтузіязму рабочае клясы—значыць ня бачыць рухаючых сіл савецкага ладу.

Тэхнічнае нормаваньне і рацыяналізацыя працы і на гэтай аснове правільная расстаноўка рабочае сілы з вучотам працоўнага энтузіязму рабочых—ключ да павышэньня вытворчасьці працы, нябачанай пры капіталізме.

Матар'ял распрацован навуковымі супрацоўнікамі НДІ т. т. Крывадубскім, Ганчаровым і Макееўскім.

Колгасьніцы да экскурсіі



У сьвінаводчым саўгасе

ЯК УСТАНАВІЦЬ НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ Ў СЬВІНАГАД[ОЎЛІ]

Норма выпрацоўкі ня ёсьць што-небудзь цьвёрда, назаўсёды ўстаноўленае. Нормы мяняюцца ў залежнасьці ад тэхнікі абслугоўваньня сьвіней. Паколькі ў розных гаспадарках тэхніка абслугоўваньня розная, дык і нормы павінны быць розныя.

І таму перад увядзеньнем у саўгасах норм выпрацоўкі рэкомэндаваных трэстам „Сьвінавод", трэба праверыць наколькі яны падыходзяць для данай гаспадаркі. Пры праверцы ўстанавіць свае корэктывы ў залежнасьці ад умоў гэтай гаспадаркі.

Дзеля гэтага трэба пра[водзі]ці хронометраж рабочага [дня]. З дакладнасьцю да дзес[яткаў] хвіліны запісваецца час, [за]чаны сьвінаром на работ[у].

У хронометражы па[вінна] быць запісана да дробязі[,] што робіць рабочы на пра[цягу] рабочага дня. Чым дакла[дней] будуць выяўлены і запі[саны] паасобныя процэсы, тым [пра]вільней можна будзе ўс[тана]віць нормы выпрацоўкі.

Хронометраж рабочага рэкомэндуецца праводзіц[ь па] наступнай форме:

Час		Працягласьць работы	Назва опэрацыі	Колькасьць раб.	Якасьць работ	Машыны і інструмант	Адлегласьць пры пераходах	Увага
Пачатак работы	Канец работы							

Маючы такі матар'ял, можна ўстанавіць, колькі часу затрачана на кармленьне, чыстку, рознага роду пераходы, прастоі і інш.

Норму выпрацоўкі трэба выводзіць ня толькі пры існуючым парадку абслугоўваньня, неабходна запраэктаваць і другі парадак догляду і ўстанавіць пры гэтым адпаведную норму. Калі ў гаспадарцы ўводзіцца якое-небудзь рацыяналізатарскае мерапрыемства і ў сьвінара аказваецца шмат вольнага часу, дык для новых умоў патрэбна новая, павялічаная норма. Знайсьці [гэтыя] ўмовы „на вока" вельмі [цяжка]. Вось чаму асабліва кар[ысны] хронометраж рабочага дн[я].

Пры хронометражы т[рэба] браць работу лепшага ў г[аспа]дарцы рабочага-ўдарні[ка і] толькі на яго работу ар[ыента]вацца пры ўстанаўленьні [норм] выпрацоўкі.

Хронометраж рабочага рэкомэндуем праводзіць патройнай паўторнасьцю. [Гэта] дасьць больш дакладныя [пака]нікі, па якіх і устанаўля[юцца] конкрэтныя для гэтай га[спа]даркі нормы выпрацоўкі.

Ліквідаваць прарыў

Смалявіцкі раён на 1-е XII-31 г. організаваў 28 СТФ, 20 МТФ і 9 ЦТФ. Аднак, раённыя організацыі і партыйна-комсамольскія ячэйкі на мясцох не замацавалі посьпехаў. СТФ укомплектаваны ўсяго на 20,6 проц., МТФ—на 82,2 проц. і ЦТФ—на 63.5 проц.

Колгасы „Чырвоны маяк", „Чырвоны ўдарнік", "Варашылава", „Прамень савецтаў", „Прогрэс", „Сталіна" сарвалі ўкомплектаваньне.

Дрэнна із будаўніцтвам сьвінарнікаў і кароўнікаў. Замест 18, будуюцца толькі 12 сьвінарнікаў і то ёсьць пагроза, што яны ня будуць скончаны да пачатку вялікіх маразоў. З 9 абор скончаны толькі 2 (і то без унутранага абсталяваньня).

У выкананьні якасных паказчыкаў—глыбокі прарыў. Здача таварнай продукцыі праходзіць яўна не здавальняюча. На 25-XI МТФ здала 60,6 проц. і СТФ 13 проц. Абураючы факт. СТФ не здалі на працягу 2 дэкад ніводнай тоны таварнай продукцыі. колгасы Жодзіна", „Бальшавік", «Уперад", комуна „Зьвязда" ігнoруюць здачу продукцыі дзяржаве.

Якую ролю адыгрывае комсамольская організацыя ў стварэньні моцнай соцыялістычнай жывёлагадоўлі? Пачынаючы з раённага камітэту і канчаючы ячэйкамі—яўная недаацэнка гэтай работы. Асноўныя працаўнікі РК ня ведаюць выконваюцца планы ў раёне, вядуць вучоту комсамольцаў загадчыкаў фэрм, сьвінароў, даглядчыкаў жывёлы. Работа комсамольцаў загадчыкаў фэрм ніколі не правяра[лася, у] выніку колгасы ня выканалі [пла]ны ўкомплектаваньня, („Чыр[воны] сьцяг", „Зорка"). Бывае, шт[о за]гадчыкі фэрм—комсамольцы [а]глядваюць на сьвінарніх, ка[р...] (Куліковіч). Бюро РК КСМ [на] працягу 3 месяцаў толькі ра[з ста]віла пытаньне аб удзеле орг[аніза]цыі ў разьвіцьці жывёлагадоў[лі]. [Не]рэдкі факты, калі сэкратары [ком]самольскіх ячэек ня ведаюць [аб] тым, што робіцца на фэрме, процант укомплектаваньня, [ці ўве]дзена зьдзельшчына і г. д. [На]прыклад, сэкратар комсамол[ьскай] ячэйкі колгасу „Культура" не [змог] адказаць на пытаньне ці ўвед[зена] прогрэсыўна-прэміяльная зьд[зель]шчына на кароўніку.

За некаторым выключэньнем [пра]ца на фэрмах організавана др[эн]на. На прэміяльна-прогрэсыўную зь[дзель]шчыну праца не пераведзена, [квітнее] абязьлічка. У колгасе „Ко[...]" „Новы сьвет" няма ўліку пр[ацы] на сьвінарніках.

Комсамол Смалявіцкага ра[ёну] абавязан ліквідаваць прарыў, раз-жа ўключыцца ва ўсесаю[знае] спаборніцтва за „тону апарос", весьці рашучую барацьбу за процантнае выкананьне плану [ўкам]плектаваньня СТФ і МТФ, за с[кон]чэньне будаўніцтва ў бліжэйш[ыя] дні, перавесьці ўсю працу на п[ро]грэсыўна прэміяльную зьдзельш[чы]ну. Ударыць па опартуністы[чнай] недаацэнцы жывёлагадоўлі.

Брыгада „ЧЗ",
Пласковіч, Бу[...]

Аб чым гавораць матар'ялы атрыманыя ў сьвінаводчых саўгасах?

НДІ сьвінагадоўлі займаецца зараз вывучэньнем організацыі працы ў сьвінагадоўлі. Для гэтай мэты покуль што ўзяты 5 сьвінагадоўчых саўгасаў БССР. Папярэдняя апрацоўка атрыманых матар'ялаў дала вельмі цікавыя вынікі:

1. Занятасьць рабочага на працягу ўсяго рабочага дня раўняецца, у большасьці выпадкаў, не 8 гадзінам, а значна менш, рэдка калі рабочыя заняты 8 гадзін, ці болей, звычайна рабочы недагружаны больш, чым на гадзіну, а ў некаторых саўгасах—да 40 проц. ад усяго рабочага часу.

2. Тэхніка абслугоўваньня амаль што ва ўсіх гаспадарках організавана так, што значную частку рабочага часу сьвінару прыходзіцца затрачваць на розныя пераходы паднoска вады і корму з кухні, паднoска апілак і інш.

Перавозка грузаў на конях абходзіцца гаспадарцы куды танней, чым пераноска іх людзьмі, а таму гэта праца павінна быць выключана з абавязкаў сьвінара. Грузы павінны перавозіцца, альбо на конях, альбо на машынах, што дасьць магчымасьць вольны час сьвінара скарыстаць для догляду за сьвіньнямі, што павысіць норму выпрацоўкі.

Гэтыя мерапрыемствы на практыцы саўгасу „Вялень" (Пухавіцкі раён) зусім сябе апраўдалі, даўшы экономію ў працсіле. Вельмі мэтазгодна папрыхтоўваць кармы выключна на кухні, па-першае, таму, што гэта дасьць магчымасьць трымаць сьвінарнікі ў чыстаце, разгрузіць іх ад кадак і яшчыкаў з кармамі і скараціць лішнія, невытворчыя пераходы. Па-другое, зьнішчыць раструску корму. Па-трэцяе, адна кваліфікаваная асоба будзе строга сачыць за нормаваным кармленьнем

Правільны вучот працы, а тым самым і правільная аплата яе зьяўляецца зараз адным з важнейшых зьвеньняў работы партыйных, комсамольскіх грамадзкіх і гаспадарчых організацый. Правільны вучот і форма аплаты працы значна садзейнічаюць ня толькі актыўнасьці і зацікаўленасьці мас, але і ўплываюць на самую вытворчасьць працы, на выхад продукцыі. Ясна, што калі ўлічваць толькі прапрацаваны час альбо колькасьць продукцыі ня прымаючы пад увагу яе якасьць, дык такія формы вучоту зьніжаюць вытворчасьць працы, альбо якасьць продукцыі. Выходзячы з гэтага, зусім зразумела, што формы вучоту і аплата працы павінны быць дапасаваны да колькасных і якасных паказчыкаў.

Вось чаму пытаньне аб перагляде форм вучоту і аплаты працы у ц сэктары сельскай гаспадаркі зараз паста ўлена ва ўсю шыр.

Пры практычным ажыцьцяўленьні гэтага пытаньня ў сьвінаводчым саўгасе „Вялень", згодна палажэньня трэсту „Сьвінавод" аб прогрэсыўнай зьдзельна-прэміяльнай сыстэме аплаты ў сьвінагадоўлі, гэта мерапрыемства зусім сябе апраўдала. Згодна палажэньня, значная доля падае на аплату якасных паказчыкаў і за выхад продукцыі, прычым у прогрэсыўна ўзрастаючым парадку. Такая форма аплаты надзвычай узьнімае зацікаўленасьць рабочага да падвышэньня колькасьці і якасьці продукцыі, зусім выкараняе абязьлічку, узмацняе працдысцыпліву зьнішчае ўраўнілаўку, дае магчымасьць правесьці мяжу паміж ударнікамі і гультаямі і г. д. і г. д. Усё гэта пацьвярджаецца на прыкладах ня толькі саўгасу „Вялень," але і саўгасу „Бабінічы" і раду іншых саўгасаў і колгасаў. Вытворчасьць працы павысілася у некаторых выпадках на 100 проц. і болей. Да ўвядзеньня прогрэсыўнай сыстэмы аплаты фактычная норма выпрацоўкі ў „Вялені" па супоросных матках была 15 галоў, зараз гэта норма дайшла да 29 галоў. Адначасова значна павысілася якасьць працы. Гэта самае назіраецца і па -групах сьвіней іншых узростаў.

Ініцыятыва сормаўскіх комсамольцаў адобрана ўсім союзам

Бюро ЦК УсеЛКСМ пастанавіла:

Адобрыць ініцыятыву Сормаўскай організацыі ЛКСМ аб правядзеньні працяглага сыстэматычнага агляду разгортваньня і далейшага палепшаньня пастаноўкі марксыцка-ленінскай вучобы комсамольцаў і комсамольскага актыву.

Прапанаваць усім абкомам, крайкомам і ЦК КСМ нацрэспублік неадкладна разгарнуць адпаведную работу па правядзеньню сыстэматычнага штодзеннага агляду разгортваньня і далейшага палепшаньня пастаноўкі марксыцка-ленінскай вучобы комсамольцаў і актыву з мэтай стварыць карэнны пералом у організацыі політадукацыі членаў УсеЛКСМ.

Кіраўніцтва агляду на АПТУ ЦК і „Комсомольской Правды"

Сэкратар ЦК УсеЛКСМ А. Косараў.

Неадкладна ўключыцца ў агляд

У сэкратарыяце ЦК ЛКСМБ

3-XII—31 г. на паседжаньні сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ былі заслуханы даклады Любаньскай Вушацкай організацыі КСМ аб становішчы марксыцка-ленінскага выхаваньня сярод комсамольцаў. Сэкратарыят адзначыў, што хаця ахоп комсамольцаў сеткай політвучобы ў гэтых організацыях кольказна павялічыўся, аднак вельмі слаба якасная пастаноўка вучобы, няма належнай увязкі з практычнымі задачамі соцыялістычнага будаўніцтва.

Сэкратарыят ЦК адобрыў ініцыятыву сормаўскай організацыі ЛКСМ аб правядзеньні агляду разгортваньня і палепшаньня пастаноўкі марксыцка-ленінскай вучобы КСМ. Усім організацыям ЛКСМБ прапанавана неадкладна ўключыцца ў агляд і распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы, каб ліквідаваць недахопы і дабіцца карэннага пералому ў пастаноўцы марксыцка-ленінскага выхаваньня.

Пастановы ЦК аб уключэньні ЛКСМБ у агляд будзе надрукавана ў бліжэйшыя дні.

Пропагандысты Аршанскага чыгуначнага вузла—організатары агляду

Пропагандысты Аршанскай чыгуначнай організацыі ЛКСМБ адабраюць ініцыятыву сормаўскай комсамоліі і ўключаюцца ў правядзеньне ўсесаюзнага агляду марксыцка-ленінскай вучобы.

Зараз на нашым чыгуначным вузьле працуюць 11 школ для комсамольцаў навічкоў, 8 тэматычных гурткоў і 1 ленінскі нач-універсытэт. Усяго гэтымі відамі вучобы ахоплена 612 комсамольцаў, што складае 85 проц. усіх комсамольцаў вузла. Акрамя гэтага ахоплена 134 асобы беспартыйнай рабочай моладзі.

У нас у пастаноўцы політвучобы яшчэ шмат недахопаў. Галоўныя з іх: няпоўны ахоп комсамольцаў політвучобай, недастатковае забясьпечаньне памяшканьнем і літаратурай, дрэнны ахоп актыву, недастатковая ўвязка вучобы з практычнымі задачамі вытворчасьці, адсутнасьць опэратыўнага кіраўніцтва ўсёй політвучобай.

Каб ліквідаваць гэтыя недахопы і палепшыць політвучобу на прыцыповую вышыню, аршанская чыгуначная комсамолія на прыкладу сормаўскіх комсамольцаў, організуе месячнік агляду політвучобы з 1-га сьнежня па 1 студзеня.

У час месячніку бярэм на сябе наступныя абавязкі: На працягу месячня ахапіць усіх комсамольцаў політвучобай, кожны комсамолец уцягвае ў політвучобу ня меней аднаго беспартыйнага.

Наладзіць у дэкадны тэрмін працу школ для комсамольцаў-правазьнікаў і кандуктароў.

Увесьці ў практыку індывідуальныя заданьні комсамольцам, якія ня маюць магчымасьці наведваць заняткі. Для сыстэматычнай падрыхтоўкі пропагандыстаў для школ навічкоў праводзіць з імі семінары на кожнай тэме.


Організаваць зьмены політгурткоў для комсамольцаў ФЗВ, якія працуюць у 3-юю зьмену.

Організаваць раённыя сэкцыі завочнікаў комсамольскага універсытэту і для консультацый пры АПА гаўінсце.

Абвясьціць соцспаборніцтва паміж школамі на лепшую работу, на лепшае ўсвоеньне матэр'ялу. У канцы месячніку правесьці політбой між політшколамі.

На лепшае правядзеньне месячніку выклікаем на соцспаборніцтва ўсіх пропагандыстаў транспортнай організацыі ЛКСМБ і Аршанскую гаразкую вытворчую організацыю.

Пропагандысты Аршанскай чыгуначнай організацыі ЛКСМБ



Заняткі ў палітшколе

Гурткі для навічкоў не працуюць

Ужо некалькі раз „Чырвоная Зьмена" сыгналізавала аб правале падрыхтоўкі да зімовай політвучобы ў колектыве КСМ заводу „Зьвязда" (Капцэвічы.)

Аднак, комсамольскі колектыў яшчэ нічога конкрэтнага не зрабіў для ліквідацыі гэтага прарыву.

20 проц. комсамольцаў ня выбралі сабе поўнага віду вучобы. Організаваныя некалькі гурткоў для навічкоў-комсамольцаў не працуюць сыстэматычна.

Мы рашуча патрабуем ад Петрыкаўскага райкому КСМ прыняць адпаведныя організацыйныя меры да кіраўніцтва колектыву, якое недаацэньвае політвучобы.

Зубасты Грышка.

Менская і Віцебская комсамолія падхапе выклік Гомельчан!

Гомельская раённая організацыя ЛКСМБ за апошні год вырасла на 4000 чалавек.

Наша організацыя ў політвучобе дабілася значных посьпехаў. Некаторыя гурткі цесна ўвязалі тэорэтычную вучобу з конкрэтнымі задачамі соцбудаўніцтва. Аднак, сучасны стан політвучобы па Гомельскай організацыі трэба значна палепшыць.

Навічкі слаба ахоплены політвучобай. У пачатковых школах навічкоў 950 чал, у гуртках бягучай політыкі 550 чал. у колгасных школах 315 чал. Усяго з 4000 навічкоў ахоплена політвучобай 1815 чал, што зьяўляецца яўна не здавальняючым.

Тэорэтычная вучоба яшчэ не ва ўсіх школах увязваецца з практычнай работай комсамолу на вытворчасьці, з мобілізацыяй слухачоў на выкананьне прамфінпляну і політычна-гаспадарчых задач.

Ня ўсюды яшчэ школы дыфарэнцыяваны адпаведна з задачамі вытворчасьці і ўзроўнем слухачоў.

Слаба ахоплен вучобай актыў—усяго 337 чал. В сь чаму набывае вялікае значэньне ініцыятыва сормаўскай комсамольскай організацыі правесьці месячнік агляду марксысцка-ленінскай вучобы.

Гомельскі гарком ЛКСМБ адабрае ініцыятыву сормаўскай комсамоліі і ўключаецца ў месячнік.

Бярэм на сябе наступныя абавязкі:

Дабіцца 100 проц. ахопу ўсіх комсамольцаў політвучобай, а таксама ўцягнуць у комсамольскую сетку політвучобы ня менш 2000 чал. беспартыйнай рабочай моладзі. Організаваць 6 груп на 200 чал. актыву для вывучэньня твораў Маркса, Леніна, Сталіна.

У сувязі з нездавальняючым станам політвучобы на транспорце стварыць адзін вагон—політшколу, увесьці у практыку індывідуальныя заданьні для комсамольцаў транспортнікаў, якія ня маюць магчымасьці наведваць заняткі.

Для вясковага раёну організаваць тры школы-перасоўкі.

Ва ўсіх комсамольскіх школах увесьці элемэнты вывучэньня тэхнікі, а таксама гісторыі і экономікі БССР.

Стварыць вопытныя вучасткі па станоўкі марксыцка-ленінскай вучобы, каб перадаваць іх вопыт астатнім колектывам і організацыям КСМ.

Вопытныя вучасткі стварыць: на Сельмашы—прыкладную школу пастаноўкі політвучобы для навічкоў, на зав. Ланцуцкага—па вучобе актыву, на „Пролетарыі"—па завочнаму навучаньню, на Дрэваапрацоўчым комбінаце—па ўзмацненьню тэхнікі і на Брылёўскім сельсавеце—па організацыі колгасных політшкол.

У час месячніку правесьці політбоі між ячэйкамі і колектывамі для праверкі ўсваеньня тэм.

З 15 сьнежня правесьці каротка тэрміновыя курсы культпропаў ячэек і колектываў.

Для колектываў і гурткоў, якія лепш пастаявіць марксыцка-ленінскую вучобу, устанавіць 4 прэміі: 1. Пераходны сьцяг гаркому ЛКСМБ. 2. поўны збор усіх твораў Леніна. 3, Бібліотэку і радыё-прыёмнік.

Выклікаем на соцспаборніцтва Віцебскую і Менскую організацыі ЛКСМБ у лепшым правядзеньні месячніку агляду. Арбітрамі просім быць газеты: „Чырвоная Зьмена" і „Комсамольская праўда".

Гомельскі Гарком ЛКСМБ.

Цягнуцца ў хвасьце злачынна

Большасьць ячэек Шклоўскага раёну яшчэ не распачалі політвучобы. Тое самае і на папяровай фабрыцы „Спартак".

Заняткі праводзяцца без праграмы. На прыкладу сормаўскай комсамоліі перадавыя організацыі праводзяць зараз месячнік агляду політвучобы. Шклоўская організацыя абавязана ўключыцца ў месячнік і тым дабіцца палепшаньня у пастаноўцы політвучобы.

Юр. Загорскі.

Торп на балоце... няма торпу ў бункерох

У месячнік штурму па вывазцы торпу зьнішчыць гэты разрыў, наладзіць плянавае забясьпечаньне палівам прамысловасьць БССР

У месячнік штурму вывезьці торп

Торп належыць топкам фабрык і заводаў. Ні адная тоны, ні адной цагліны высушанага і складзенага ў штабелі торпу не павінны мы пакінуць на балоце. Гэта—баявая задача комсамольскай організацыі торпапрамысловасьці і электростанцый фабрык і заводаў, якія спажываюць тарпяны апал. Максімум увагі комсамольскай дзейнасьці трэба правяць у вывозны торпу, у правільнай організацыі працы і расстаноўцы рабочай і гужавой сілы, наладзіць політмасавую працу і культ-бытавое абслугоўваньне рабочых, занятых на нагрузцы і вывазцы торпу.

Штурмавы месячнік па вывазцы торпу, абвешчаны колектывам Белторпу пры ўдзеле і дапамозе ЦКК НК РСІ павінен зьявіцца баявым вытворчым экзаменам для раённай комсамольскай організацыі Менску, 3-ці са вне ... Бабруйску, Віцебску, Барысава, Шклова, Дуброўны, Магілева, Клімавіч, Гомеля, Уваравіч, Чашнікаў Цэрахоўкі, Асіпавіч, Полацку і Сіроціна.

Комсамольскія камітэты гэтых раёнаў павінны аказаць органам працы конкрэтную дапамогу у заключэньні умоў на рабочую і гужавую сілу. Паставіць працу так, каб за працягу адной дэкады накіраваць 5036 фурманак на вывазку. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на організацыю набор рабочай і гужавой сілы, на заключэньне умоў з колгасамі.

Разам з гэтым, трэба асаблівую ўвагу зьвярнуць на палепшаньне чыгуначнага транспарту, на прысьпешаньне будаўніцтва намечаных чыгуначных шляхоў на пасобных торпазаводах. І тут правільная організацыя і расстаноўка рабочае сілы, механізацыя нагрузачна-разгрузачных работ і паслядоўнае ажыцьцяўленьне 6 умоў т. Сталіна вырашаць посьпех у правядзеньні штурмавога месячніку.

У гэтым годзе тарпяная прамысловасьць упяршыню накіруе электростанцыям, фабрыкам і заводам новы від торпа фрэзэрную крошку. Торпазаводам, якія здабывалі фрэзэрны торп і яго спажыўцом неабходна прыступіць да пераабсталяваньня неабходнай колькасьці вагоннага парку. Ні ў якім разе не адтэрміноўваць вывазку фрэзэрнага торпу. Трэба выкарыстаць мэтэоролёгічныя ўмовы для гэтай працы.

Месячнік вывазкі торпу скарыстаць і для падрыхтоўкі балот к сэзону 1932 году. У гэтым напрамку неабходна хутчэй зацьвердзіць у вышэйшых органах прамфінплян торпазаводаў на 1932 год. Пасьля канчатковага зацьвярджаньня, неабходна гэты плян паставіць на абмеркаваньне рабочых, дабіўшыся сустрэчных лічбаў, якія-б поўнасьцю ўлічвалі тэхнічныя магчымасьці кожнай машыны, агрэгата, улічвалі-б новыя ўмовы працы тарпяной прамысловасьці.

У штурмавы месячнік трэба вывезьці ўвесь загатоўлены торп да яго спажыўца. Гэта праца—складанае праца. Толькі пры шырокім удзеле ўсёй рабочай масы, пры дапамозе ўсёй пролетарскай грамадзкасьці будзе забясьпечана пасьпяховае выкананьне стопроцантнай вывазкі торпу к вызначанаму тэрміну, будзе забясьпечана своечасовая падрыхтоўка балот да новага сэзону". (З адозвы штабу штурму).

П

Ня спальваць дроў—форсаваць вывазку торпу

Нова-Барысаў. Перад торпазаводам „Чырвоны Кастрычнік" пастаўлена адказьнейшая задача—забясьпечыць фабрыкі і заводы мясцовым апалам, даць у 1931 годзе прамысловасьці 46500 тон торпу. З гэтай баявой задачай кіраўніцтва торпзаводу ня справілася. „Чырвоны Кастрычнік" гадавое заданьне па здабычы торпу выканаў на 60 проц. і „Комунар"—на 12,5 проц..

Такое становішча стварыла пагрозу своечасоваму забясьпечаньню фабрык і заводаў Барысава мясцовым—тарпяным апалам. Галоўная прычына несвоечасовая падрыхтоўка заводаў да торпасэзону. Падрыхтоўчая работа (карчоўка, асушка і плінтоўка балота) на заводзе „Комунар" праведзена са значным спазьненьнем, здабываць торп пачалі толькі у другую палову сэзону. 6 умоў таварыша Сталіна ня былі пакладзены ў аснову ўсёй вытворчай працы. Заводзкія організацыі не перайшлі да організаванага набору рабочай сілы: ня былі заключаны ўзаемныя дагавары з колгасамі, адсутнасьць соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў працы, не ўкаранёны гаспадарчы разрахунак і зьмена-сустрэчнае плянаваньне ў брыгадах.

Торпзавод „Комунар" мае вялікія пэрспэктывы ў забясьпячэньні барысаўскай прамысловасьці мясцовым тарпяным апалам. Апошнія досьледы яскрава сьцьвярджаюць гэта. Вялікія запасы і надзвычай высокая калёрыйнасьць торпу могуць задаволіць апалам фабрыкі і заводы Барысава на працягу некалькіх дзесяткаў год.

З першага студзеня торпзавод „Комунар" пераходзіць пад ведама Бярэзінскага комбінату, у сувязі з гэтым Белторп, не чакаючы перадачы, амаль поўнасьцю спыніў кіраўніцтвам фінансаваньне заводу. Абязьлічанае кіраўніцтва пагражае зрывам падрыхтоўчых работ да новага сэзону.

Вельмі дрэнна і з транспортам торпу. Ня глядзячы на перабоі у рабоце ЦЭЦ з прычыны вострага недахопу апалу, 1600 тон загатоўленага торпу вывозяцца вельмі марудна. Замест пастрэбных 150-160 падвод, торп возяць ня больш як 20-25. Адміністрацыя Бярэзінскага комбінату ўвесь свой транспорт накіравала на вывазку дроў. З-за такой нераспарадчасьці ЦЭЦ працуе выключна на дровах без падбаўкі торпу.

У рабоце заводаў „Чырвоны Кастрычнік" і „Комунар" патрэбна неадкладна зрабіць рашучы пералом.

Бэлта

№ 230
(1549)

Усе на вечар інтэрнацыянальнай сувязі!

Рэзалюцыі міжнароднай гаварыльні

ЗАГЛУШАЮЦЦА СТРЭЛАМІ ГАРМАТ ЯПОНСКІХ АКУПАНТАЎ

Японскія захватнікі „протэстуюць"...

ТОКІЁ, 3. Як паведамляюць, прадстаўнік міністэрства замежных спраў заявіў, што японскі ўрад катэгарычна пярэчыць супроць такога пункту проекту рэзолюцыі Лігі нацый: „Калі ў момант прыбыцьця камісіі Лігі Нацый высьветліцца, што бакі ня выканалі абавязкаў, якія вынікаюць з рэзолюцыі Лігі нацый ад 30 лістапада, дык камісія павінна прапанаваць належныя захады". Японскі ўрад супярэчыць супроць гэтага пункту, лічачы яго „фальшывым" выказваньнем недавер'я к Японіі, „захаваным устанаўленьнем тэрміну эвакуацыі", а таксама „працягваньнем кітайскай прапановы".

Японскі ўрад таксама пярэчыць супроць прапаноў „аб хутчэйшай эвакуацыі". На думцы японскага ўраду ня прызнана таксама, каб прадстаўнікі дзяржаў прапягвалі інформаваць лігу нацый, паколькі гэта прапанова адзначае, на думцы Японіі, „стварэньне другой дасьледчай камісіі" і па сутнасьці абмежаваньне функцый.



На здымку тав. Бэркман Э.—адна з арганізатараў нацыянальнага (рэволюцыйнага) саюзу тэкстыльшчыкаў і кіраўнік 25 тысяч бастуючых тэкстыльшчыкаў у Лаўрэнцы—апынілася ў паліцэйскай турме. Тав. Бэркман была арыштавана ў час гэтай забастоўкі, і пасьля першага арышту ўзяла на сябе кіраўніцтва забастоўкай. Цяпер урад узьняў справу аб высылцы тав. Бэркман з Амэрыкі.

Арышты западозраных у дачыненьні да компартыі

ТОКІЁ. 3. „Дэнпо Цусін" з Чжандао паведамляе, што японская паліцыя ў Чжандао (на мяжы з Корэяй) 2-га сьнежня арыштавала 12 кітайцаў і карэйцаў западазроных у прыналежнасьці да компартыі, у тым ліку Цын-Юя-Цзяна, які нібыта зьяўляецца кіраўніком мясцовай комуністычнай арганізацыі.

* * *

ТОКІЁ. Японскія параходныя прадпрыемствы за пэрыод з пачатку манчжурскага інцыдэнту панесьлі страт ня менш 100 млн. іен, прычым 55 млн. іен. страцілі у выніку бойкоту.

Грандыёзныя мітынгі протэсту супроць расправы над удзельнікамі рэволюцыйных дэмонстрацый

СТОКГОЛЬМ. 3. Па паведамленьню з Осло, учора ў горадзе Скіен (Норвэгія) пачалося слуханьне справы 28 рабочых, якія прымалі ўдзел у дэмонстрацыях протэсту супроць штрэйкбрэхераў у чэрвені г. г. Гэтая дэмонстрацыя, як вядома прывяла да крывавых сутычак рабочых з паліцыяй.

Ня гледзячы на супраціўленьне рэформістых, па ўсёй краіне пад кіраўніцтвам компартыі Норвэгіі і рэволюцыйнай профопозыцыі адбыліся грандыёзныя дэмонстрацыі і мітынгі, на якіх высоўвалася патрабаваньне неадкладна спыніць суд і вызваліць арыштаваных рабочых.

Грандыёзны мітынг, на якім сабралася больш 8 тыс. рабочых, адбыўся ў Скіене. У Осло і іншых гарадох на радзе прадпрыемстваў праведзены 5-ці хвілінныя стачкі протэсту.

Протэстуйце супроць зьверстваў польскага фашызму

Затрымаць руку катаў

Новы сьмяротны прысуд над рэволюцыйнымі рабочымі

БЭРЛІН. 3. Як паведамляюць з Варшавы, палявы суд Петракова прыгаварыў да кары сьмерцю праз павешаньне 2 рабочых: 29 гадовага Малеўскага і 30 гадовага Закржэўскага за ўдзел 3 лістапада ў антымілітарысцкім мітынгу на абарону СССР перад буйнейшай польскай фабрыкай штучнага шоўку ў Тамашове.

ЦК компартыі Польшчы зьвярнуўся з адозвай да міжнароднага пролетарыяту выступіць з протэстам супроць прывядзеньня ў выкананьне прыгавору і супроць масавых забойстваў рэволюцыйных рабочых і сялян у Польшчы.

У Верхняй Сілезіі чакаецца звальненьне 15 тысяч гарнякоў

ВАРШАВА. Катавіцкія „Палёнія" падае з інформаваных крыніц, што ў жалезнай прамысловасьці Верхняй Сілезіі ў хуткім часе мае быць звольнена 15 тысяч гарнякоў. Весткі гэтыя зьяўляюцца тым больш праўдападобныя, што ўжо ў канцы лістапада прамыслоўцы зьвярнуліся да дэмобілізацыйнага камісара з прапановай звольніць 10 тысяч рабочых з жалезных капальняў.

Скарыстаньне школы для шпіёнскіх мэт

ВАРШАВА. Катавіцкая „Полёнія" піша, што мясцовае бюро ўрадавага „беспартыйнага блёку" разаслала настаўнікам усіх школ павету анкету з 31 пытаньнем. Гэта анкета надзвычай выразна сьведчыць аб ролі школы ў фашысцкай Польшчы. Сярод пытаньняў ёсьць, напрыклад, такія: Пытаньне 13-ці арганізавана моладзь па-за школай а калі так, дык у якіх арганізацыях і хто стаіць на чале гэтых арганізацый? Пытаньне 7-е: Якія палітычныя арганізацыі існуюць у вашым раёне і хто стаіць на чале іх? Пытаньне 26-е: Якія газэты і часопісы выпісвае насельніцтва вашай мясцовасьці?

Падтрымаць барацьбу Чэхаславацкага пролетарыяту
Буржуазія напалзіла крывавую баню

БЭРЛІН 3. Эўропэйскі сэкратарыят Профінтэрну апублікаваў сёньня адозву да рабочых усіх краін з поваду крывавых падзей у Чэха-Славакіі. У адозьве гаворыцца, што крывавая баня, наладжаная чэхаславацкай буржуазіяй, выклікала вялікае абурэньне рабочых мас усіх краін.

Міжнародны рэволюцыйны пролетарыят павінен рашуча протэставаць супроць забойцаў рабочых у Чэха-Славакіі і падтрымаць барацьбу чэха-славацкага пролетарыяту. Адозва заклікае арганізаваць масавыя мітынгі, сходы і дэмонстрацыі протэсту супроць соцыял-фашысцкага тэрору, увязваючы гэтую кампанію з барацьбой пролетарыяту за работу, хлеб і свабоду.

Адозва канчаецца заклікам: „За баявы пролетарскі адзіны фронт усіх рабочых, за міжнародную барацьбу супроць нацыянал-фашызму і соцыял фашызму".

Сёньня ў клюбе харчавікоў, а 7 гадзіне ўвечары, адбудзецца вял... інтэрнацыянальны вечар, прысьвеча... праверцы выкананьня соцдагаво... паміж комсамолам Менску і комсам... лам Лейпцыгу і провады саксонск... дэлегацыі.

Пасьля вечару будзе дана пас... ноўка „Ботвін".

Білеты атрымаць у ГК ЛКСМБ.

ГАРКАМО.

Конкурс нізавога друку „Правд...

ХТО НАСТУПНЫ?

У першых радох комсамол Засла... шчыны: ён разгарнуў сапраўдную барацьбу з... соцыялістычную жывёлагадоўлю

Множце пачын перадавых

Заслаўскі раён уключыўся ў конкурс

Заслаўскі РК ЛКСМБ з вялікім спазьненьнем уступіў у конкурс „Праўды". Аднак, дзякуючы прыезду брыгады „Ч. З.", райком комсамолу вызначыў рад практычных масавых мерапрыемстваў, якія забясьпечаць правядзеньне конкурсу.

6-га сьнежня адбудзецца нарада комсамольцаў членаў рэдколегіі па пытаньню падрыхтоўкі к пленуму ЦК ЛКСМБ. На нарадзе будзе таксама абгаварана і пытаньне аб уключэньні ўсёй арганізацыі ў конкурс.

7-га сьнежня ва ўсе комсамольскія ячэйкі выяжджаюць брыгады райактыву для практычнай дапамогі ў арганізацыі пры кожным саўгасе, колгасе і МТС, а таксама і ўстанове да 1-1-32 году насьценгазэт штодзёнак.

На 13 сьнежня склікаецца агульнараённы зьлёт юнкораў сумесна з комсамольцамі навічкамі, дзе распрацоўваюць мерапрыемствы сталінскага паходу і конкурсу нізавога друку.

19 сьнежня праводзіцца сумес... райгазэтай „Комунар Заслаўшчыны" усёраённы рэйд для разгортван... конкурсу нізавога друку.

20-га сьнежня выпускаецца пер... нумар маладзёжнай старонкі пры ... газэце.

Да 1-га студзеня распаўсюджва... 500 экз. „Чыр. Зьмены" 300 экз... „Комсамольской правды", 300—„Га... ты для крестьянской молодежи" і ... —„Комунара Заслаўшчыны".

Уся гэта праца цесна ўвязана ... сталінскім паходам. Ужо 3 комсамо... скія ячэйкі практычна ўключыліся ... конкурс нізавога друку і сталін... паход.

Далейшае разгортваньне арганіз... цыйна-масавай работы забясьпечы... уключэньне усіх комсамольскіх яч... у конкурс і баявую работу арганіз... цыі на фронце вытворчага замацава... ня колгасаў.

Я. Казлоў

Да усіх комсамольцаў, усёй рабочай і колгаснай моладзі жывёлагадоўчых раёнаў БСС...

Мы — комсамольцы Заслаўскай ячэйкі МТС, — надаючы асаблівае важнае значэньне разгортваньню конкурсу нізавога друку на лепшую працу шматтыражкі, штодзёнкі і насьценгазэты па арганізацыйна-гаспадарчаму умацаваньню колгасаў і лепшаму ўдзелу у сталінскім паходзе, уключаемся у конкурс нізавога друку і бярэм на сябе наступныя абавязкі:

1. Аб'яўляем сябе ўдарнікамі конкурсу нізавога друку. Абавязваемся забясьпечыць актыўны ўдзел у працы нізавога друку і асьвятленьні ходу конкурсу арганізаванымі матар'яламі ў газэце „Чырвоная Зьмена".

Забясьпечыць сталы, бесьперабойны выхад насьценгазэты пры МТС, перавёўшы яе на штодзённае выданьне, паказаўшы на вопыце як неабходна змагацца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў.

Сіламі ячэйкі наладзіць сталы опэрацыйны выхад насьценгазэты-штодзёнкі пры колгасе імя Будзённага. Для арганізацыі працы і дапамогі комсамольскай ячэйцы колгасу вылучыць т. т. Чорнага, Саўчука, Анцыпаровіча, даручыўшы ім забясьпечыць на працягу сьнежня разгортваньне масавай работы, поўнае ўкараненьне прэміяльна-прогрэсыўнай зьдзельшчыны, ліквідацыю абязьлічкі, правільную расстаноўку сіл колгасу, улік працы па колькасьці і якасьці працадзён і ра... меркаваньне ўраджаю на аснове п... вільнага ўліку работы.

Зараз, калі вырашана збожжав... проблема, перад намі застаец... яшчэ адна важнейшая задача-выр... шэньне мясной проблемы. У ху... кім часе гэтага можна дабіцца пр... разгортваньне сьвінагадоўлі. Ячэй... КСМ МТС бярэ на сябе ініцыятыв... к 1-I—32 году арганізаваць пр... сталовай адкормачны пункт на 2... сьвінаматак, над якім узяць шэф... ства, выдзеліўшы ня менш 5 ча... лепшых комсамольцаў-ударнікаў д... сталай працы на сьвінарніку.

Абавязваемся забясьпечыць ... 20 сьнежня МТС і колгасу імя Б... дзённага поўнае выкананьне ўс... відаў нарыхтовак, аб'явіўшы ра... чую барацьбу месьніцка-спажывец... кім настроям і перавялічэньню ф... давых занарадак.

З 15-га сьнежня арганізуем пр... ячэйцы МТС і колгасе Будзённ... гурткі па аўладаньню агрозоотэхн... кай, прыцягнуўшы да гэтае пр... цы ўсіх агрономаў і вэтэрынарыу...

Падрыхтоўваем матар'ял для ... маладзёжных старонак райгазэт... па 20-XII-31 г.

Выдаем к 15 сьнежня маладзёжныя куткі пры насьценгазэтах МТС і колгасу імя Будзённага.

Выклікаем на соцыялістычнае спаборніцтва ўсе ячэйкі КСМ Заслаўскага і Лагойскага раёну і ўсіх астатніх жывёлагадоўчых раёнаў БССР.

Арбітрам абіраем „Чырвоную Зьмену" і РК ЛКСМБ.

Тэрмін дзеяньня ўмовы прапануем да 1-га мая 1932 г.

Агульны сход ячэйкі КСМ МТС

Адказны рэдактар Л. Перліна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу №А—2522.